**І. І. Кірчук,**
*старшы выкладчык кафедры культуралогіі*
*і псіхолага-педагагічных дысцыплін ІПКіПК*

# ТРАДЫЦЫЙНЫЯ БЕЛАРУСКІЯ АБРАДЫ І СВЯТЫ: АКТУАЛЬНЫЯ ПЫТАННІ РЭКАНСТРУКЦЫІ Ў КАНТЭКСЦЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПРАГРАМ ДАДАТКОВАЙ АДУКАЦЫІ ДАРОСЛЫХ

У новым тысячагоддзі дзякуючы нацыянальнаму адраджэнню ўзнікла цікавасць да свайго мінулага, гісторыі, культуры, у тым ліку да народных традыцый, звычаяў, абрадаў. Звычаі і абрады беларусаў у канцы XIX – пачатку XX ст. уяўлялі сабой стройную сістэму, у якой знайшлі адлюстраванне бакі народнай культуры, быту, філасофіі, рэлігіі, светаўспрымання і светаасэнсавання. Адначасова яны з'яўляюцца часткай духоўнай культуры і народнага быту.

У народнай творчасці выяўляецца культурная і сацыяльная самабытнасць нацыі, фарміруецца яе светапогляд. Асабліва гэта праяўляецца ў мове народа, вуснай літаратуры, музыцы, танцах, гульнях, міфалогіі, абрадах, звычаях, рамёствах, архітэктуры і іншых відах мастацкай творчасці. Адной з важных задач сучаснасці з'яўляецца выжыванне традыцыйнай культуры ў сувязі з пашырэннем глабалізацыйных працэсаў. Таму тэматыка народнай творчасці ў адукацыі і культуры доўга будзе заставацца актуальнай.

Адраджэнне, або рэканструкцыя таго ці іншага свята – справа нялегкая. Таму перш трэба ўважліва звярнуцца да вытокаў культуры кожнага рэгіёна Беларусі і абменяцца вопытам і назапашаным тэкставым, меладычным, інструментальным і харэаграфічным матэрыялам да правядзення свят і рэканструкцыі звычаяў і абрадаў.

Абавязковай арыентацыяй у перападрыхтоўцы з'яўляецца выкарыстанне двухвекавога гістарычнага запісу беларускіх свят і абрадаў Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору – 50 тамоў серыі «Беларуская народная творчасць». У іх ёсць грунтоўныя ўступныя артыкулы вядомых фалькларыстаў, дзе раскрываецца гісторыя паходжання і змест святаў, даецца гісторыя іх запісаў, вывучэння, аналізуецца бібліяграфія і мастацкае напраўленне сутнасці. Тут меладыя, спеў, гучанне

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычных інструментау і рытмаў, скокі, танец, вопратка, маскі і нарэшце адпаведнае прыроднае асяродзе, пара года, рэгіянальнае месцазнаходжанне, якое фарміруе мастацкі каларыт.

Ва ўмовах сусветнай глабалізацыі і індустрыялізацыі праблема рэальнага далучэння моладзі да нацыянальнай культуры з'яўляецца вельмі складанай. Таму ў сістэме перападрыхтоўкі спецыяліста неабходны пэўныя ўмовы: новыя тэарэтычныя, арганізацыйна-тэхнічныя, сучасныя падыходы да выхавання і адукацыі, адзіная дзяржаўная палітыка ў галіне адукацыі і выхавання, а таксама нацыянальная праграма, якая ўлічвала б асаблівасці культуры, музыкі, побыту, менталітэту, нацыянальных традыцый. Таму патрэбна вырашыць задачу перападрыхтоўкі творчага настаўніка і выхавацеля, здольнага забяспечыць разнастайныя формы працы з калектывамі.

Абрады – частка традыцыйна-бытавой культуры народа, якая зарадзілася ў першабытным грамадстве і ўтрымлівае элементы песеннага, харэаграфічнага, драматычнага, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва. Абрады былі звязаны з гаспадарчай дзейнасцю, бытавымі ўмовамі, грамадскімі адносінамі і падзяляліся на каляндарна-вытворчыя (земляробчыя, паляўнічыя, жывёла гадоўчыя, рыбалоўныя), сямейна-бытавыя (вясельныя, радзіныя, пахавальныя), грамадскія і царкоўныя. Такім чынам з іх дапамогай уздзейнічаць на незразумелыя з'явы прыроды.

Большасць беларускіх абрадаў старажытнага паходжання ўзнікла на агульнай усходне-славянскай глебе. Старажытная абраднасць ляжыць у аснове калядавання, масленіцы, шчадравання, купальскай ночы і інш. Многія абрады звязаны з культам продкаў (дзяды, радаўніца), расліннасці. Галоўная задача – раскрыць гістарычныя вытокі, адметныя рысы быту і культурныя традыцыі беларускага народа, і скіраваць увагу на выкарыстанне нацыянальнага каларыту пры пераасэнсаванні і рэканструкцыі святаў.

Разнастайныя мерапрыемствы кожны год праходзяць у гарадах і вёсках, этнаграфічных музеях. Сярод іх – знакамітыя музычныя і тэатральныя форумы, фестывалі народнай культуры, старажытных рамёстваў і нацыянальнай кухні. Таксама велікасвецкія балі, рыцарскія турніры і рэканструкцыі эпохі Сярэднявечча, незвычайныя экалагічныя святы. Можна пабачыць і зусім унікальныя, характэрныя толькі для адной мясцовасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

абрады. Напрыклад, «Калядныя цары» (в. Семежава, Капыльскі раён, Мінская вобласць), «Жаніцьба Цярэшкі» (вёска Аношкі, Лепельскі раён, Віцебская вобласць).

У гомельскім філіяле Веткаўскага музея народнай творчасці імя Ф. Шклярава адбылася рэканструкцыя старажытнага абрадавага свята «Жаніцьба коміна», Абрад быў прымеркаваны да пераносу асноўных прац з поля ў хату. Менавіта ў гэты час у хаце ладзіўся комін – старажытная прылада для асвятлення з дапамогай лучыны. Раней, да з'яўлення газавых лямп і электрычнасці, комін быў шырока распаўсюджаны на тэрыторыі Жыткавіцкага, Лельчыцкага, Петрыкаўскага раёнаў Гомельскай вобласці.

Студэнцкае Этнаграфічнае Таварыства, пры падтрымцы Любанскага раённага цэнтра культуры, праводзіць ў вёсцы Шыпілавічы рэканструкцыю каляндарна-абрадавых святаў «Купалле» і «Пятрок».

Гэта маладёжная грамадская арганізацыя з 1998 г. ладзіла шматлікія этнаграфічныя экспедыцыі ў самыя розныя рэгіёны Беларусі. Складзены і вялікі архіў нематэрыяльнай культурнай спадчыны, што захавалася ў краіне. Таварыства цесна супрацоўнічае з навукова-даследчымі і навучальнымі ўстановамі.

У Давыд-Гарадку Столінскага раёна Брэсцкай вобласці 13 студзеня праводзіцца абрад на Шчодры вечар, які мясцовыя людзі называюць «Конікі».

Абрад «Куры» – своеасаблівая візітоўка вёскі Віркаў Клічаўскага раёна. У яго свае традыцыі: ніякіх коз і мядзведзяў. Таму і ўдзельнікі абраду – дзеці ад 6 да 14 гадоў. Вясёлай птушынай сямейкай лётаюць яны па дварах, спяваюць віншавальныя песні. Так тут калядавалі спакон веку, а зусім нядаўна абрад быў прызнаны нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасцю Беларусі. Напярэдадні кожнага Старога Новага года маленькая вёска Віркаў зноў жыве ў прадчуванні цуда. Жыхары пякуць бліны і рыхтуюць розныя прысмакі. Трэба ж не пакрыўдзіць куранят.

На Дзяржыншчыне ў вёсцы Скірмантава дагэтуль ладзяць спецыяльны абрад «Пячы ката». Са спецыяльных булак пэўнай формы выпрабляецца фігура ката: кавалачкі аб'ядноўваюцца паміж сабой, вушкі кату робяць з сала, вочкі з чарніц, далучаецца хвост са свойскай каўбасы.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Абрэду «Цягнуць каляду на дуба» вёскі Навіны Бярэзінскага раёна таксама нададзены статус нематэрыяльнай гісторыка-культурнай каштоўнасці Рэспублікі Беларусь.

Кожны абрад істотна дапаўняе нашы веды аб светапоглядзе продкаў. Абрад і яго глыбокая сутнасць цікавыя для ўсіх, хто хоча ведаць свае карані.

Нажаль і ва ўласных сем'ях і ў практыцы выхаваўчых і адукацыйных установ мы далёка не поўна выкарыстоўваем гэты найбагацейшы патэнцыял, створаны нашымі продкамі. Сустрэчы з слухачамі, круглыя сталы па тэме «Дзіцячы фальклор. Сучасны стан, рэпертуар дзіцячага калетыву» паказваюць шмат памылак і недапрацовак. Напрыклад, уводзіны ў рэпертуар дзіцячых калектываў фрагментаў вясельнага абрада, выбар настаўнікамі любоўных і сямейна-бытавых песень, што недапушчальна пры дыферэнцыраваным выхаванні малодшага ўзросту.

Яшчэ больш памылак у інтэрпрэтацыі святаў – пераняесенне іх на сцэну, на радыё- і тэлебачанне. Але ў такіх выпадках недапушчальна мастацкае спрашчэнне, скажэнне, фальсіфікацыя. Пры інтэрпрэтацыі спецыялісты павінны прытрымлівацца рэгіянальна-самабытных з'яў, тэатралізацыі, пераапранання, ужывання масак, песень, танцаў. Найбольш складана ідзе падрыхтоўка такіх масавых свят, як «Купалле» і «Каляда» з-за вялікай плыні інфармацыйнага патоку з СМІ, Інтэрнэта, тэле- і радыёкрыніц. Імкненне капіраваць папулярныя шоў-праграммы прыводзіць да змешвання рускага, украінскага, беларускага і польскага фальклору, што з'яўляецца парушэннем мясцовых традыцый і згубленнем рэгіянальнага каларыту.

Асаблівасцю курса з'яўляецца скіраванне ўвагі на ўдзел у міжнародных і рэспубліканскіх фестывалях, святах і забавах, дзе неабходна дзяліцца вопытам і пераймаць лепшыя тэндэнцыі захавання традыцыйнай культуры.

Улічваючы асабісты вопыт працы і ўдзел у міжнародных фестывалях фальклору і народнай творчасці, мы шчыра дзелімся багацейшым архівам са слухачамі: аўдыя і відэа, канцэртнымі праграммамі і рэпертуарам. Стварэнне фальклорнай лабараторыі з архівам сусветнай музыкі і народных інструментаў дапамагае ў напрамках дзейнасці ўніверсітэта культуры і мастацтваў: у дадатковай адукацыі, павышэнні кваліфікацыі і перападрыхтоўцы спецыялістаў.



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У дадзеным курсе спалучаюцца тэмы тэарэтычнага і практычнага напрамкаў. Слухачам прапануецца шырокае кола пытанняў, звязаных з прафесійнай кампетэнтнасцю, набыццём практычных навыкаў арыентацыі ў складаных праблемах культурнай рэчаіснасці. Асноўны спектр метадычных напрацовак прадстаўлены рознымі тыпамі фалькларызму ў культурна-адпачынкавай дзейнасці, сцэнічнаму ўвасабленню традыцыйных свят і абрадаў, іх сучаснай рэжысуры і тэатралізацыі. Разглядаецца разнастайны прафесійны вопыт, тэхналогіі стварэння этнакультурных праектаў, рэклама і PR як інавацыйныя метады папулярызацыі народнай творчасці, камп'ютарныя тэхналогіі ў музычным афармленні абрадаў і святаў. Падчас круглых сталоў і майстар-класаў, прысвечаных разнастайным тэхналогіям, слухачы змогуць набыць новыя веды, уменні, неабходныя ў працы спецыялістаў метадычных цэнтраў народнай творчасці і клубных устаноў.

На працягу адукацыйнага працэсу выкладчыкі ўжываюць як традыцыйныя (вербальныя і наглядныя), так і інтэрактыўныя (круглыя сталы, майстар-класы, гульнёвыя і інш.) метады навучання. Выкарыстоўваюцца мультымедыйныя і камп'ютарныя сродкі навучання, дэманструюцца відэаматэрыялы.


1. *Аляхновіч, А. М.* Народная песня ў мастацкай самадзейнасці / А. М. Аляхновіч. – Мінск : Універсітэцкае, 1991. – 109 с.

2. *Аляхновіч, А. М.* Беларускі музычны фальклор / А. М. Аляхновіч, М. В. Рахчэеў, У. Д. Каструлёў. – Мінск : Універсітэцкае, 1996. – 335 с.

3. *Гуд, П. П.* Тэхналогія стварэння свята : вучэб. дапам. / П. П. Гуд. – Мінск : Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтва, 2004. – 224 с.

4. *Лозка, А. Ю.* Беларускі народны каляндар / А. Ю. Лозка. – 2-е выд., перапрац. і дап. – Мінск : Полымя, 2002. – 240 с.

5. *Лозка, А. Ю.* Тэатралізаваныя школьныя святы / аўт.-склад. А. Ю. Лозка, І. І. Кірчук. – Мінск : БелЭн, 2004. – 176 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ